**Абрамовіч, С.** Афганскія зімы коханаўскага хлопца / С. Абрамовіч // Наша Талачыншчына. – 2009. – 14лют. – С. 4.

**АФГАНСКІЯ ЗІМЫ КОХАНАЎСКАГА ХЛОПЦА**



На прахадной «Белтрубпласта» дзяжурыць Алег Шчаблякоў. У гэтага добразычлівага, адкрытага чалавека акрамя цяперашняй працы ахоўніка ёсць вопыт трактарыста і слесара. А яшчэ – тры зімы, праведзеныя ў Афганістане. Чамусьці менавіта імі вымераў ён той свой жыццёвы перыяд, неахвотна згадзіўшыся сказаць хоць колькі слоў-успамінаў.

Пайшоў у армію, калі было яму крыху больш за васемнаццаць гадоў. Трапіў у пагранічныя войскі ў Туркменістан, і пасля трох месяцаў скарочанай «вучэбкі» апынуўся ў Афганістане. Размяшчалася яго часць у ваколіцах горада, назву якога Алег ужо не памятае. Памятае зімы, падчас якіх самай нізкай тэмпературай была мінус чатырнаццаць. Памятае саслужыўцаў з Екацярынбурга, Харкава, Кіева. З адным сябрам, гамяльчанінам, неяк выпадкова сустрэўся, калі вяртаўся з турыстычнай экскурсіі. Знаёмы, падтрымлівае сувязь з іншымі коханаўцамі, што прайшлі праз Афганістан. Разам адзначаюць дзень 15 лютага, наведваюць могілкі. З Аляксандрам Алюшыным, за якога крыху старэйшы, быў знаёмы асабіста, выраслі ў адным двары.

Нездарма, напэўна, з ваеннага жыцця Алегу запомніліся зімы. Са старажытных часоў паняцце «перазімаваць» у чалавечай свядомасці аса-цыіруецца з паняццем «застацца жывым». Кожны, хто быў на вайне, незалежна ад таго, наколькі блізка судакрануўся са смерцю, у якія больш ці менш небяспечныя сітуацыі трапляў, у любы момант мог чакаць самага горшага, самага страшнага. Чакаць і спадзявацца, што лёс будзе літасцівым.

Алег мае дачку і сына. Задаволены сваёй працай, на якой дні дзяжурства чаргуюцца з выхаднымі.

– Асабліва добра, што летам можна спакойна на дачы ўсё паспець парабіць, – з усмешкай адзначае ён.

Размаўляеш з гэтым субяседнікам і думаеш, што лепш ніколі не ведаць чужых зім, хоць і цяплейшых, мякчэйшых, але гарачых ад смяротнага агню і цяжкіх ад пастаяннага страху за жыццё. Лепш трымаць у руках не зброю, а прылады для працы на дачы ці прысядзібным участку.

**С. Абрамовіч**